■ Ёсць праблема

УДЫХ ГЛЫБОКІ. РУКІ — ШЫРАЙ!

Чаму вытворчая гімнастыка стала перажыткам мінулага

Хто застаў савецкія часы, памятае, як у 11 гадзін па ўсесаюзным радыё пачыналася трансляцыя вытворчай гімнастыкі. Прыемны голас дыктаркі агучваў практыкаванні, якія трэба выканаць, каб размяць апорна-рухальны апарат, атрымаць прыліў бадзёрасці.

Мільёны працаўнікоў па ўсёй вялікай краіне ўставалі з рабочых месцаў, пад кіраўніцтвам штатнага альбо пазаштатнага інструктара выконвалі комплекс нескладаных практыкаванняў. І пераставала ныць спіна, ішоў прыток крыві да розных участкаў цела. У неабходнасці такой фізкультмінуткі ніхто не сумняваўся, ніхто не ставіць пад сумненне карысць фізічных практыкаванняў і цяпер. Дык ці ад той спадчыны мы адмовіліся?

СПАЧАТКУ БЫЎ ІНСТРУКТАР

З месяц таму давялося пабываць на пінскім трыкатажным прадпрыемстве «Палессе». Некалі — знакаміты ў палескім рэгіёне гігант лёгкай прамысловасці, цяпер ААТ таксама не апошні ў горадзе вытворца і падаткаплацельшчык. Прадпрыемства зараз перажывае не самыя лепшыя часы, знаходзіцца ў стадыі дасудовага аздараўлення і паступова выходзіць з крызісу. Абсалютная большасць работнікаў — жанчыны, многія занятыя ў швейным і іншых цэхах, дзе прадугледжана сядзячая работа. Генеральны дырэктар «Палесся» Таццяна Лукіна сказала тады, што яны падбіраюць кандыдатуру інструктара па спорце і разглядаюць магчымасць укаранення вытворчай гімнастыкі. Зараз, роўна праз месяц, намеснік гендырэктара Людміла Шмат паведаміла карэспандэнту, што такі чалавек падабраны, для яго знайшлі палову стаўкі ў штатным раскладзе, але ён будзе займацца спартыўна-масавай работай. Яна запэўніла, што на прадпрыемстве будуць разглядаць магчымасць укаранення вытворчай гімнастыкі.

ПАГАЛОЎНАЯ АПТЫМІЗАЦЫЯ

Застаецца спадзявацца, што на «Палессі» зробяць добрую справу на карысць здароўя работнікаў. Тут хоць разглядаюць магчымасць, не адмаўляюць таго, што актыўны перапынак патрэбны супрацоўнікам.

На жаль, прыкладу таго, што названая гімнастыка ўвайшла ў практыку вытворчага працэсу, адшукаць на Брэстчыне не ўдалося. Хіба што наадварот. Напрыклад, на вядомым баранавіцкім баваўняным аб'яднанні, таксама гіганце савецкіх часоў, нядаўна скасавалі чвэрць стаўкі спартыўнага інструктара. Зроблена гэта, вядома, у парадку аптымізацыі ў спадзяванні, што фінансавыя справы пойдуць лепей. Але ці выратуе рэнтабельнасць прадпрыемства гэтая чвэрць стаўкі? Як вядома, апошнім часам дзяржава ўкладвала вялікія сродкі ў мадэрнізацыю названага вытворцы баваўняных тканін. Сродкі выдзялялі найперш для таго, каб захаваць калектыў і прадпрыемства ў горадзе. А калектыў — гэта яго людзі з іх здароўем і працаздольнасцю, што асабліва актуальна цяпер, калі пенсійны ўзрост паступова расце.

Наш абласны цэнтр вызначаецца мноствам вялікіх і малых прыватных прадпрыемстваў па пашыве жаночага адзення. І ў горадзе, і ў Брэсцкім раёне такіх фірмаў і фірмачак — дзясяткі. Дырэктару аднаго такога прадпрыемства Уладзіміру Хілько я і патэлефанавала са сваім пытаннем. Вытворчасць у «Бурвіна» салідная: 250 работнікаў, большасць з іх жанчыны, нармальная зарплата, прыстойны сацыяльны пакет. «Чаго няма, таго няма», — адказаў Уладзімір Васілевіч на пытанне і пажартаваў: калі зрабіць перапынак на гімнастыку, то што застанецца нашым дзяўчатам на перакур? Потым назваў факт, які вельмі непакоіць: ледзь не большая палова маладых жанчын фабрыкі курыць, што, вядома, не самым лепшым чынам уплывае на іх здароўе. Дык можа, варта на гэтым прадпрыемстве ўшанаваць тых, хто не выходзіць на перакуры, менавіта карыснай для здароўя гімнастыкай? Напрыклад, у той час, калі іх калегі глытаюць дым? Дырэктар абяцаў падумаць над прапановай.

ТОЛЬКІ БІЗНЕС

У кантэксце гэтых разважанняў праглядваюцца дзве праблемы. Першая — нежаданне кіраўніцтва траціць хоць бы мінімальныя сродкі і намаганні на працэс аздараўлення членаў калектыву. Тым больш што ніхто не прымушае гэта рабіць. У савецкія часы вытворчая гімнастыка пачалася з пастановы ўрада, якая была прынятая ў красавіку 1930 года. А пастановы тады выконвалі, спачатку нібы пад прымусам, потым — па прывычцы. Добрай прывычцы. Адразу практыкаванні рабілі пад строга патрыятычную музыку, а ў 80-х нават пад песню Высоцкага. Памятаеце: «Вдох глубокий. Руки шире. Не спешите: три, четыре!»? І рабілі гімнастыку, і ўсе былі задаволеныя. Адзін з цяперашніх маладых кіраўнікоў сказаў у неафіцыйнай гутарцы, што яму не падабаюцца нашы павольныя работніцы, каб яго воля, ён бы набраў дзяўчат з В'етнама, тыя працуюць як пчолкі, бальнічнага не просяць, пра сацыяльны пакет не згадваюць. Словам, нічога асабістага. Толькі бізнес.

Старшыня Брэсцкага абкама прафсаюзаў работнікаў лёгкай прамысловасці Ірына БАХМУЦКОВА адзначыла:

— Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі не раз спрабавала адрадзіць забытую традыцыю вытворчай гімнастыкі. Вярнуць добрую справу хацелі нават на заканадаўчым узроўні, але замацаваць норму заканадаўча не ўдалося. Звычайна парламентарыі гаварылі, што работнікі заўсёды могуць «націснуць» на кіраўніцтва і правесці гэты радок праз калектыўны дагавор. Тэарэтычна гэта правільна, а на практыцы мы бачым, што адбываецца. Мне шкада, але я не ведаю такога прадпрыемства нашай галіны ў рэгіёне, дзе б праводзілі вытворчую гімнастыку.

ЧАС ВЫПРАЎЛЯЦЬ ПАМЫЛКІ

Сапраўды, у такой сітуацыі і самі работнікі, скажам, праз прафкамы, маглі б дзейнічаць больш рашуча і настойліва. Гэта другая праблема. Калі для сябе яны адстойваюць хвіліны для перакураў, то маглі б пры жаданні адстаяць карысную для здароўя справу. Але нашы людзі наогул не вельмі прывыклі клапаціцца пра сваё здароўе. Гэта таксама факт. Значыць, здаровы лад жыцця і ўсё, што з ім звязана, трэба прасоўваць рашуча і настойліва з дапамогай грамадскасці альбо пэўных дзяржаўных інстытутаў. **Галоўны пазаштатны спецыяліст па лячэбнай фізкультуры галоўнага ўпраўлення па ахове здароўя Брэсцкага аблвыканкама Уладзімір ПЕРШУКЕВІЧ** сказаў:

— Мы добраахвотна адмовіліся ад найважнейшага мерапрыемства, накіраванага на захаванне здароўя. 10—15 хвілін, выдзеленыя на фізічныя практыкаванні, не зробяць шкоды вытворчаму працэсу, а для здароўя людзей была б вялікая карысць. Хваробы пазваночніка, канечнасцяў цяпер маладзеюць. Выдаткі на лячэнне работніка непараўнальныя са стратамі вытворчасці ад хвілін на гімнастыку. Чамусьці ў нас на гэта зусім мала звяртаецца ўвагі. Што казаць пра бізнес, калі многія ўстановы аховы здароўя скарачаюць штаты спецыялістаў ЛФК. Такія рашэнні лічу глыбока памылковымі. Памылкі ж рана ці позна давядзецца выпраўляць.

Святлана ЯСКЕВІЧ

...МОКРЫ НОС І СТРЭСАВАЯ ЎСТОЙЛІВАСЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Кінолаг нясе сутачнае дзяжурства разам са сваім сабакам. Але пры неабходнасці ён можа браць на дапамогу і другога чатырохногага памочніка. Напрыклад, абваліўся дом, выехаў кіналагічны разлік. І сабака як быццам бы кагосьці знайшоў. Калі ў кінолага ўзнікаюць сумненні, ці ёсць нехта пад завалам, то ён выпусціць другога сабаку ў якасці кантрольнага.

Увогуле, калі сабака паступае на службу, то яго стартавы ўзрост складае ад трох да шасці месяцаў. Шчаня павінна прайсці даволі складаны тэст. Па-першае, абавязкова ўлічваецца радаслоўная. Калі нехта з «бацькоў» ужо служыць у кінолагаў, то шанцы, што ў малога сабакі будзе адпаведная генетыка, павялічваюцца. Па-другое — характар. Калі шчанюк выказвае агрэсію, то яго адбракуюць тут жа. Нашы сабакі павінны быць дружалюбнымі, паколькі іх задача — дапамагаць тым, хто трапіў у бяду. Затым іх чакае ветэрынарны агляд. Яго задача — выявіць, каб у жывёлы не было ніякіх адхіленняў у фізічным развіцці. А вось пасля мы шчанюка тэстуем на палахлівасць. На яго надзяваюць спецыяльную амуніцыю, падвешваюць за яе на вышыню і назіраюць за рэакцыяй. Навошта гэта патрэбна? Справа ў тым, што мы можам вылецець на верталёце і дэсантавацца ў любы пункт краіны. У такім выпадку сабака спускаецца ў звязцы з кінолагам з вышыні прыкладна ў 50 метраў. Таксама нашы памочнікі не павінны баяцца тэхнікі, выбухаў, гуку працуючых інструментаў... Проста яны працуюць непасрэдна з кінолагам і ўвагу звяртаюць выключна на яго.

І калі шчаня паспяхова прайшло ўсе тэсты, то пачынаецца перыяд яго навучання, які доўжыцца сама меней год.

Працоўны век сабакі ў кіналагічным разліку не вельмі доўгі — да васьмі гадоў. Рэкордны ўзрост, у якім нёс службу наш чатырохногі памочнік, складаў 12 гадоў. Старажылу цэнтра Оскару ўжо сем. Усе іншыя яго «калегі» маладзейшыя.

Калі сабака дасягнуў «пенсійнага» ўзросту, то ствараецца спецыяльная камісія. Яна робіць ветэрынарны агляд, правярае фізічны стан і тэстуе жывёлу на вынослівасць. Напрыклад, работа сабакі на завале доўжыцца 30 хвілін. Калі наш хвастаты памочнік стамляецца пасля 15—20 хвілін працы — значыць, ён ужо не можа выконваць сваю функцыю на ўсе сто. Але спісанне з работы не азначае, што ад сабакі адмаўляюцца. Як правіла, кінолаг сабаку забірае да сябе дадому. Яны ж гадамі складаюць адно цэлае — кіналагічны разлік. Гэта твой напарнік, з якім ты нясеш службу, у якога ўкладваеш шмат сіл. Самі сабакі таксама за гэты час моцна прывязваюцца да кінолага. І што ж, пасля ўсё гэта перакрэсліць і здрадзіць сябру?

— А ў вас дома ёсць сабака?

— Так, але не лабрадор, а такса. Мая напарніца Айса, з якой працую, вельмі маладая, ёй усяго паўтара года. Зусім нядаўна яна «скончыла» спецыялізаваны курс падрыхтоўкі, а паступіла да нас з кіналагічнага цэнтра Узброеных Сіл.

Сёлета кінолагі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях выязджалі тройчы на месцы здарэнняў, звязаных з абвальваннем будаўнічых канструкцый.

— Сабаку трэба заахвочваць, — дзеліцца сакрэтамі Ігар Апановіч. — Таму, калі ён знаходзіць чалавека, — ці то на вучэннях, трэніроўцы, ці то ў рэальнай абстаноўцы, — сабака атрымлівае прыз у выглядзе смачнага пачастунку або цацкі. Агулам жа мы можам працаваць без перапынку на завалах да трох сутак. Але па жорсткім рэгламенце — разлікі змяняюцца праз кожныя паўгадзіны.

Аднак каб адшукаць чалавека пад завалам, патрэбны доўгія і працяглыя трэніроўкі. На кожны дзень у кінолагаў складзены план заняткаў са сваім гадаванцам. Акрамя практыкаванняў на двухсотметровай паласе перашкод непасрэдна на базе нашай службы, мы выязджаем на вучэнні і на будоўлі, і ў лес. Здараюцца і кур'ёзныя выпадкі: мы акрэслілі межы ўчастка, умоўныя пацярпелыя схаваліся ў траве, — і тут аднекуль з'яўляецца іншы чалавек. Натуральна, да яго падбягае сабака і пачынае брахаць, пакуль не падыдзе кінолаг. А пасля аказваецца, што гэта грыбнік...

Але большасць выездаў у спецыялістаў звязана з мірнымі мэтамі. Напрыклад, у Дзіцячым рэабілітацыйным цэнтры для дзяцей-інвалідаў кінолагі — даволі частыя госці. Малым з асаблівасцямі развіцця патрэбна догатэрапія.

— Наколькі ў службовых сабак адчувальная розніца паміж «хлопчыкамі» і «дзяўчынкамі»?

— «Хлопчыкі» больш вынослівыя. Але ў гэтага медаля ёсць і адваротны бок. Яны больш актыўныя, часам замест трэніроўкі хочуць пагуляць, ды і ўвогуле патрабуюць большай увагі. А вось з «дзяўчынкамі» працаваць прасцей. Яны больш пакладзістыя і адданыя кінолагу. Зрэшты, як і ў людзей, тут усё індывідуальна.

* * *

Хутка кінолагі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях займеюць адну цікавую тэхналагічную навінку. На ашыйнікі сабак, якія займаюцца пошукамі зніклых у лясах, будуць прымацоўвацца адмысловыя GPS-трэкеры. Яны стануць перадаваць сігналы на навігатары кінолагаў, куды запампуюць вельмі падрабязныя карты. Такім чынам, кінолаг у лесе не будзе арыентавацца выключна на брэх сабакі (які пры гэтым можа адбегчы і на дзясятак кіламетраў), а паглядзіць на патрэбныя каардынаты мясцовасці і пойдзе туды найкарацейшым шляхам. Такім чынам, і часу на пошукавыя аперацыі спатрэбіцца ўжо меней.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Фота атрымана ад кіналагічнай службы Цэнтра пошукава-выратавальных работ і пажаратушэння Рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.